# У ДРУЖНАЙ СЯМ'І НАРОДАЎ СССР

**17** верасня працоўныя нашай рэспублікі адзначылі 18-ю гадавіну ўз'еднання беларускага народа ў адзінай Беларускай совецкай социялістычнай дзяржаве. У гэты памятны дзень у 1939 годзе ўзброеныя сілы нашай Радзімы, выконваючы волю совецкага народа, перайшлі заходнія рубяжы, каб узяць пад абарону жыццё і маёмасць адзінакроўных братоў, якім пагражала фашысцкае заняволенне.

На працягу амаль дваццаці год насельніцтва заходніх абласцей Беларусі, насільна адарваных імперыялістамі ад сваёй маці-Радзімы, падвяргалася жорсткай эксплуатацыі з боку польскіх памешчыкаў і капіталістаў, знаходзілася пад социяльным і нацыянальным прыгнечаннем. Дзеці беларусаў не мелі магчымасці вучыцца ў школе на сваёй роднай мове, якая ўсяляк праследавалася рэакцыйнымі польскімі правіцелямі. На беларускай мове не выдавалася ніводнай газеты ці часопіса. Цемра, нястача і бескультур'е панавалі ў Заходняй Беларусі.

Прамысловасць была прадстаўлена дробнымі саматужнымі прадпрыемствамі. На душу насельніцтва тут выпрацоўвалася амаль у дзевяць разоў менш прамысловай прадукцыі, чым у сярэднім па СССР, і ў пяць разоў менш электраэнергіі, чым ва ўсходніх абласцях БССР. У заходніх абласцях прамысловая вытворчасць не толькі не расла, а скарачалася з году ў год. У машынабудаўнічай і шкляной прамысловасці, напрыклад, колькасць рабочых з 1913 па 1939 год зменшылася амаль у два разы, а ў тэкстыльнай— у 6 разоў. У запушчаным стане знаходзілася тут і сельская гаспадарка.

Уз'яднанне ў брацкую сям'ю совецкіх народаў адкрыла перад працоўнымі Заходняй Беларусі небывалыя перспектывы для сапраўднага росквіту эканомікі і культуры. Паўсюдна ў заходніх абласцях разгарнулася грандыёзная работа па будаўніцтву новых і рэканструкцыі старых прамысловых прадпрыемстваў. Ужо ў 1940 годзе вытворчасць прамысловай прадукцыі і электраэнергіі тут падвоілася ў параўнанні з 1938 годам. Было поўнасцю ліквідавана беспрацоўе, якое з'яўлялася страшным бічом для працоўных не толькі гарадоў, але і сёл. Па прыкладу сваіх усходніх братоў, перакананаўшыся ў перавазе калектыўнай працы, сяляне заходніх абласцей пачалі аб'ядноўвацца ў калгасы. Да пачатку Айчыннай вайны тут ужо налічвалася 1115 калгасаў і 101 МТС.

У пасляваенны перыяд дзякуючы самаадданай працы і бескарыслівай дапамозе брацкіх народаў СССР працоўныя Беларусі не толькі хутка залячылі цяжкія раны вайны, але і рушылі ўперад развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры. У цяперашні час Беларусь з'яўляецца рэспублікай магутнай індустрыі. У 1956 годзе аб'ём прамысловай прадукцыі ў параўнанні з дарэволюцыйным узроўнем павялічыўся ў 22 разы, а ў параўнанні з 1940 годам — у 2,7 раза. На БССР прыпадае цяпер значная доля ў агульнасаюзнай прамысловай вытворчасці. У 1956 годзе ў рэспубліцы выраблена 8,1 працэнта ўсіх металаапрацоўчых станкоў, выпушчаных у СССР, 10 працэнтаў матацыклаў, 16 працэнтаў веласіпедаў, больш 13 працэнтаў торфу, звыш 7 працэнтаў аконнага шкла, вялікая колькасць трактараў і аўтамабіляў.

Прыкметныя поспехі дасягнуты ў развіцці сельскай гаспадаркі. Колькасць калгасаў, якія атрымліваюць мільённыя даходы, за апошнія чатыры гады ўзрасла ў дваццаць з лішнім разоў. Няўхільна расшыраецца сетка школ, культурна-асветных і медыцынскіх устаноў. Калі да рэволюцыі ў Беларусі было 266 тысяч вучняў, то цяпер штогод займаецца звыш 1300 тысяч дзяцей працоўных. Звыш 110 тысяч чалавек навучаецца ў ВНУ, тэхнікумах і іншых специяльных сярэдніх навучальных установах. Паказальна, што ў ВНУ БССР на кожныя дзесяць тысяч насельніцтва вучыцца 64 студэнты, у той час, як у Францыі—37, у ФРГ—27.

У Беларусі выдаюцца сотні газет і часопісаў на роднай беларускай мове. Многатысячнымі тыражамі выходзяць кнігі. У 1956 годзе, напрыклад, на кожныя сто чалавек насельніцтва ў Беларусі было выдана 160 кніг, у той час, як у 1940 годзе — 110 і ў 1913 годзе—1.

Адзначаючы 18-ю гадавіну ўз'еднання ў адзінай Совецкай дзяржаве, беларускі народ яшчэ цясней згуртоўваецца вакол роднай Комуністычнай партыі, робіць усё для таго, каб унесці дастойны ўклад у агульнанародную справу барацьбы за перамогу комунізма ў нашай краіне.

**Т. Кандрацьеў.**